Источник: "Народная газета" - 2013-02-08

# Кнігочей

**У гэтым кніжным аглядзе даведаемся пра жыццё-быццё нашых продкаў, а таксама пра іх мастацкія густы**

## Невычэрпная крыніца

"Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць" — гэтае выданне ўбачыла свет ў выдавецтве "Беларуская навука". Яно аб'ядноўвае работы, прысвечаныя мінуламу горада, крыніцам яго гісторыі, якія напісаны з выкарыстаннем розных падыходаў і адлюстроўваюць шырокі тэматычны спектр. Храналагічны ахоп даследаваных праблем — ад XII да XXI стагоддзя.




На прыкладзе Мінска можна вывучаць самыя разнастайныя аспекты жыцця нашых продкаў: грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і духоўна-культурныя. Сярод тэм — эканоміка, культура і канфесійная гісторыя. Сапраўды, гісторыя Мінска з'яўляецца багатай і невычэрпнай крыніцай для даследчыкаў гарадскога жыцця Беларусі, з якой можна даведацца, як жылі людзі раней, пра што яны думалі, да чаго імкнуліся, якія ў іх былі дасягненні і памылкі. Усё гэта цікава і важна ў тым ліку і для таго, каб выкарыстаць вопыт папярэдніх пакаленняў у самых розных сферах сучаснага жыцця.

## Захаваныя помнікі

У выдавецтве "Беларусь" выйшла кніга "Помнікі мастацкай культуры Беларусі".

Чытаем у анатацыі: "З найбольш цікавымі экспанатамі калекцый Музея старажытнабеларускай культуры, размешчанымі ў экспазіцыйных залах, штогод знаёмяцца тысячы наведвальнікаў з Беларусі, аматары, знаўцы даўніны і спецыялісты-даследчыкі з краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Амерыкі. У апошнія гады былі ажыццёўлены буйныя выставачныя праекты за межамі рэспублікі — у Арменіі, Польшчы, Францыі, Англіі.




Аб найбольш ранніх станковых творах вядома з літаратурных і архіўных крыніц, у якіх згадваюцца толькі асобныя абразы і партрэтныя выявы, у рэдкіх выпадках даецца іх апісанне (хутчэй указваецца, што напісана). Захаваныя ж помнікі датуюцца пачынаючы з XV стагоддзя. Але і яны нешматлікія. Няўмольны час не пашкадаваў многае са створанага тагачаснымі майстрамі, пакінуўшы літаральна адзінкавыя работы..."

**Святлана ДЗЯВЯТКАВА /НГ/**